Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 28 Вільня, Нядзеля 12 Кастрычніка 1930 г. Год VI (XIV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Беларускі Нацыянальны Камітэт і „Цэнтральны Саюз“ беларускай санацыі злучыцца ня могуць.

У працягу двух дзён 2 і 3 г. м. на прапазыцыю „Цэнтрсаюзу“ беларускай санацыі, адбыліся перагаворы прадстаўнікоў выбарнага К-ту „Цэнтрсаюзу“ і Часовай Выбарнай Камісіі Беларускага Нацыянальнага К-ту ў справе стварэньня адзінага беларускага фронту на выбары.

Дня 4.Х прадстаўнікі Час. Выб. Камісіі Беларускага Нацыянальнага К-ту атрымалі ад Выбарнага К-ту ,,Цэнтрсаюзу‘‘ беларускай санацыі ультыматыўнае пісьмо, у якім сказана:

...,,запрапанаваць Беларускай Выбарнай Камісіі: прыступіць да ўтварэньня агульна-беларускага выбарнага блёку, зьліквідаваўшы тую ўмову, якая заключана Беларускай Выбарнай Камісіяй з Украінскімі Палітычнымі Партыямі і даць адказ на гэтую прапазыцыю ў працягу 24 гадзін. Неатрыманьне адказу да 4 гадзіны 5 кастрычніка 1930 г. будзем лічыць за зрыў адзінага беларускага выбарнага фронту‘‘.

Пісьмо падпісалі: ,,За Урад Галоўнага Выбарнага Камітэту Цэнтральнага Саюзу Беларускіх Культурна-Прасьветных і Гаспадарскіх Арганізацыяў і Інстытуцыяў — Старшыня — Ф. Акінчыц, Сэкрэтар — К. Крук.

Пасьля такой пастаноўкі справы з боку ,,Цэнтрсаюзу‘‘ злучэньне Нац. К-ту з гэтым ,,саюзам‘‘ выключаецца, бо Нац. К-т ня можа адказацца ад саюзу з украінцамі.

Разам з Украінцамі!

Дня 2 Х. с. г. пачаліся перагаворы з аднаго боку паміж групай беларускіх полёнофілаў“, якія групуюцца каля газэты „Наперад і так зв. „Цэнтрасаюзам на чале з Луцкевічам, да каторых цяпер далучыўся і Акінчыц, а з другога боку — паміж Агульна-Беларускай Выбарнай Камісіяй, якую выбраў Бел. Нац. Камітэт у Вільні. Гэтыя перагаворы цягнуліся пару дзён і не прывялі да пажаданага рэзультату. — Дня 4.Х. полёнофілы паставілі прадстаўнікам Бел. Нац. К-ту катэгарычны варунак: **„зьліквідаваць тую ўмову, якая заключана Беларускай Выбарнай Камісіяй з украінскімі палітычнымі партыямі“**. Калі ў працягу 24 гадзін умова з Украінцамі ня будзе зьліквідавана, яны, г. зн. полёнофілы, будуць лічыць адзіны беларускі выбарны фронт сарваны.

Што меў рабіць Бел. Нац. Камітэт? Паддацца жаданьням полёнофілаў і сарваць сувязь з Украінцамі, ці наадварот: паддзяржаць сувязь з украінцамі, а парваць з полёнофіламі? Выбар быў даволі лёгкі — і затым Бел. Нац. Камітэт на сходзе дня 5.Х. с. г. пастанавіў сарваньне перагавораў прыняць да ведама.

Значыць агульна-беларускага выбарнага блёку і на гэты раз ня будзе — ды, праўду кажучы і не магло быць. Бо хто такія Луцкевіч, Крук і Акінчыц? Ці яны твораць нейкую самастойную групу, якая можа пакіравацца сабою ў палітычным жыцьці незалежна ад пастаронькіх дзейнікаў? Ці яны прадстаўляюць сабою нейкую сілу, з каторай трэба было-б лічыцца, як з беларускай групай?

Вось-жа скажам ясна: гэта група залежна ў сваей дзейнасьці ад сваіх апякуноў, і гэта група робіць тое, што ёй скажуць. А сілу сваю яна паказала ў Лідзкіх выбарах, дзе на чале з Янкам Станкевічам сабралі яны трохі болей як тысячу галасоў!... Як на „вялікую“ групу, дык саўсім мала.

А што сказаць аб іхным жаданьні парваць блёк з братнім украінскім народам і то ў 24 гадзіны?!

Трэба сказаць, што тут „наша“ санацыя выявіла, хто яна ёсьць і паказала ясна свой палітычны твар. Дагэтуль яна магла яшчэ запярэчываць усім закідам аб полёнофільстве, магла казаць, што яна і не санацыя, але цяпер ужо няма як. Жадаючы парваньня з украінцамі, яна паказала сваю палітычную лінію. Народ аб гэтым павінен ведаць.

А цяпер што да нас, дык з украінцамі мы парваць ня можам. Нас, беларусаў, злучыла з імі адна доля і ў мінуўшчыне і сучаснасьці. Народ украінскі таксама як і народ беларускі — гэта сярмяжная, працоўная маса, якая разам павінна ісьці да лепшай долі. Мы разам ішлі на выбары ў 1922 і 28 годзе, разам працавалі на соймавым грунце і выступалі на кангрэсах Нац. меншасьцяў, урэшце ў 1929 годзе дня 27.XI. заключылі саюз, на падставе каторага пастанавілі **„пачаць цясьнейшае супрацоўніцтва ў бязупыннай барацьбе за правы сваіх народаў“**.

І ад гэтага саюзу мы маем адказацца ў імя намечаных ідэалаў „нашай“ санацыі? Кожны сьведамы беларус, які цэніць дружбу з украінцамі, скажа: не!... Адказацца ад саюзу з братнім украінскім народам мы ня можам. Гэтак сказалі і мы.

Галава Украінскай парлямантарнай рэпрэзэнтацыі Д-р Д. Левіцкі, будучы ў Вільні 25.III. с. г. на сьвяткаваньні 12-х угодкаў абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, сказаў, што Украінскі народ заўсёды быў і будзе разам з народам Беларускім. На гэтае мы тады казалі і цяпер кажам: **народ Беларускі заўсёды быў і будзе разам з народам Украінскім.**

Аб гэтым няхай ведае кучка „нашых“ санатараў-полёнофілаў, якая пашла па паваду сільных гэтага сьвету.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Паседжаньне Цэнтральнага Камітэту Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі. Дня 28 верасьня с. г. адбылося паседжаньне Цэнтральнага К-ту Б. Х. Д. з удзелам старшыні Камісіі Рэвізыйнай

Цэнтральны Камітэт Б.Х.Д. нараджаўся на сваім паседжаньні ў справе выбараў у Сойм і Сэнат і ў справах партыі меншай вагі, як справа газэты „Бел. Крыніца“ і інш.

У часе нарадаў аб выбарах, калі абгаварываліся кандыдатуры паслоў ад партыі, б. пасол Павал Каруза заявіў, што ён з прычын ад сябе незалежных кандыдаваць у Сойм на гэты раз ня можа.

Ц. К. Б.Х.Д. пастанавіў кандыдатамі на пасольскіх сьпісках ад сваей партыі выставіць зусім новых людзей.

Дзеля гэтага быўшыя паслы Б.Х.Д. на сьпісках ад Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі кандыдаваць на гэтых выбарах у Сойм ня будуць.

Акадэміі. З прычыны 25-х угодкаў творчасьці Янкі Купалы, якія прыпадаюць у сёлетнім годзе, віленскае беларускае грамадзянства зладзіла дзьве акадэміі. Адна акадэмія адбылася ў салі Віленскай Беларускай гімназіі ў суботу 27 верасьня, на якой прачытаў рэфэрат аб творчасьці Янкі Купалы А. Луцкевіч, а другая адбылася ў нядзелю 28 верасьня ў літоўскай салі пры вул. сьв. Мікалая 8, ладжаная Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры, на якой прачытаў рэфэрат так-жа аб творчасьці Янкі Купалы б. сэнатар В. Багдановіч.

Акадэміі адбыліся вельмі ўрачыста, на якіх былі прадэклямаваны некаторыя вершы Я. Купалы, а на першай адыграны сцэнічны твор „На Папасе“ і гімназіяльны хор пад кіраўніцтвам грам. Шырмы прыгожа прапяяў некалькі беларускіх песьняў.

Агульны Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту. У нядзелю 5 г. м. адбыўся агульны сход Бел. Нац. К-ту з удзелам прадстаўнікоў віленскага беларускага грамадзянства. На гэтым сходзе разглядаліся справы выбараў у Сойм і Сэнат.

Часовая Агульна Беларуская Выбарная Камісія, якая была створана Нац. Камітэтам на сходзе 7 верасьня с. г. дзеля аб‘яднаньня беларускіх арганізацыяў, каб пайсьці на выбары адзіным усебеларускім фронтам і заключэньня дагавору на выбары з іншымі народнымі меншасьцямі, дала справаздачу з сваей дзейнасьці, пасьля чаго падалася ў адстаўку, і гэтым закончыла сваю місію.

Агульны сход Бел. Нац. К-ту выслухаўшы справаздачу Часовай Агульна Беларускай Выбарнай Камісіі, з якой выясьнілася, што:

1. на выбары заключаны блёк з украінскімі палітычнымі групамі пад назовам „Беларуска-Украінскі блёк“;

2. Усе беларускія нацыянальныя групы, апрача санацыйных, аб‘яднаны пад сьцягам Нац. К-ту.

3. Камісія вяла перагаворы з „Цэнтральным Саюзам“ (саюз беларускай санацыі), які зьвярнуўся з прапазыцыяй злучэньня ў блёк, але даведаўшыся аб заключэньні дагавору з украінцамі паставіў варунак развязаньня „Беларуска-Украінскага блёку“, на што Ча-

совая Агульна Бел. Выб. Камісія не згадзілася, дзеля чаго далейшыя перагаворы былі спынены.

4. Зьезду Камісія склікаць не магла з прычыны ад яе незалежнай.

Сход пастанавіў:

Вітаючы блёк з братнім Украінскім народам, дзейнасьць Камісіі ў справе перагавораў з „Цэнтральным Саюзам“ беларускай санацыі прызнаць правільнай і выбраць Агульна-Беларускі Выбарны Камітэт з 7 асоб, якому і даручыць усю далейшую выбарную справу.

Акт абвінавачаньня. Улады судовыя гэтымі днямі даручылі рэд. нашай газэты Я. Пазьняку акт абвінавачаньня, якім рэд. Пазьняк абвінавачаны па 132 ст. К. К. за зьмяшчэньне ў „Бел. Крыніцы“ стацьці пад загалоўкам „Беларускае полёнофільства.“

Спэктакль вучняў Віл. Бел. Гімназіі. У суботу 4 г. м. у салі Віл. Бел. Гімназіі вучні тае-ж гімназіі ладзілі спэктакль, на якім адыгралі драму Ф Аляхновіча „Бутрым Няміра“. Не зважаючы на некаторыя мамэнты, дзе адчувалася даволі многа недахопаў, драма адыграна добра.

Адбіраньне аружжа ў б. паслоў. Па загаду Віленскага Староства на днях на прыватную кватэру б. пасла А. Стэповіча зьявілася паліцыя і забрала ў А. Стэповіча рэвальвэр разам з дазволам на права нашэньня аружжа.

„Студэнская Думка“. У канцы мінулага м-ца с. г. выйшла, пасьля доўгага перарыву, часопісь беларускай студэнскай моладзі „Студэнская Думка“. У гэтым нумары між іншымі артыкуламі даволі паважнымі спатыкаем і сажністыя стацьці зьместу чыста палітычнага.

Прыкладам стацьця пад загалоўкам „Рэфлексы“ пяра Міхася Тулейкі. У гэтай стацьці аўтар, пішучы аб адносінах беларускага студэнства да Беларускага Нацыянальнага Камітэту, праўда, даволі наіўна прабуе падарваць аўторытэт гэтай беларускай народнай установы. Гэтак сяньня паступае ў адносінах да ўсякай беларускай незалежнай установы і думкі кожны сьведамы польскі служка. Грам. Тулейцы злой волі ў гэтым мы ня прыпісваем, але ў яго выпадзе проціў Беларускага Нац. К-ту бачым наіўную палітычную нясьведамасьць сучасных беларускіх палітычных кірункаў. Бліжэй разглядаць гэтых публіцыстычных красачкаў грам. Тулейкі ня будзем, бо мы верым, што гэты выпад — гэта звычайны „плод не долгой науки“ і што ён больш не паўторыцца.

У другой стацьці тэй-жа „Студэнскай Думкі“ пад загалоўкам „Шануйма народныя вартасьці“ „страляе“ па „Бел. Крыніцы“ і „не санатар і санатар“ Ст. Станкевіч. А справа вось у чым. — „Бел. Крыніца“ — бачыце—спрафанавала“ беларускі ваяцкі гымн „Мы выйшлі шчыльнымі радамі“, бо перарабіла яна на сатыру проціў санацыі. Дык пазволім сабе запытацца ў „шаноўнага“ аўтара гэтай стацьці, — ці так-жа спрафанавана несьмяротная поэма Вергілія „Энэіда“, з якой І. Катлярэўскі зрабіў укрытую сатыру, а В. Равінскі беларускую, робячы з яе „Энэіду“ на выварат?!! Думаем, што пасьля гэтай „абароны“ санацыі (бож ня гымну гэнага!), пачырванее сама санацыя, а тымчасам—танцуй уража, як пан скажа!..

Звальненьне В. Шутовіча. Арыштаваны палітычнай паліцыяй 20.IX. с. г. В. Шутовіч па некалькіх днях пасьля арышту звольнены.

Беларускія каапэратыўныя курсы праз карэспандэнцыю. Беларускі Студэнцкі Саюз у хуткім часе праектуе адчыніць „Беларускія Каапэратыўныя Курсы праз карэспандэнцыю,“ якія будуць абыймаць сабою ўсе веды ў галіне каапэрацыі, як: гістарычную, тэорэтычную, практычную і бухгальтэрыю. Мэтаю курсаў будзе прыгатаваньне ідэовых кіраўнікоў спажывецкіх каапэратываў на мясцох. Курсы будуць трываць 10 месяцаў, у працягу якіх кожны вучань будзе атрымліваць што тыдзень новую лекцыю, па вывучэньню і ахапленьню якое мусіць будзе напісаць і пераслаць да кіраўніцтва курсаў пісьменнае апрацаваньне на тэмы з данае лекцыі прыложаныя ў яе канцы. Па здавальняючым адказе на ўсе лекцыі, кожны вучань атрымае пасьведчаньне, даючы яму пяршэнства ў заняцьці мейсца кіраўніка спажывецкага каапэратыву. Хто мае ахвоту і пачуваецца да абавязку скончэньня гэтых курсаў, ужо цяпер пісьменна павінен паведаміць Беларускі Студэнцкі Саюз (Вільня, Віленская 8—3), прысылаючы адказ на такія пытаньні: 1. Імя і прозьвішча, 2 мейсца сталага жыцьця, 3. колькі год. 4. якая адукацыя (на курсы буцуць прымацца асобы, кончыўшыя найменш 3 аддзелы пачатковае школы), 5. ці цікавіцца каапэрацыяй і ці знаёмы ўжо з ёю трохі. Аб часе распачацьця навукі ўсе зарэгістраваныя асобы будуць павядомлены асобна.

Аплаты за навуку, па зваротам коштаў на паперу, на друк і паштовыя маркі, ня будзе ніякай.

Беларуска-Літоўскі Камітэт дзеля сьвяткаваньня 500 гадоўшчыны сьмерці Вял. Кн. Вітаўта на сваім паседжаньні 9 г. м. пастанавіў наладзіць урачыстае сьвяткаваньне юбілею Вітаўта 27.X. с. г.

Каталіцкі Камітэт Беларусаў і Літоўцаў на паседжаньні ў мінулым тыдні пастанавіў выдаць малітвеньнік: для беларусаў па беларуску, для літоўцаў па літоўску.

Крызыс у беларускай вучыцельскай сэмінарыі імені Фр. Багушэвіча. Як мы пісалі, вучыцельская сэмінарыя імені Фр. Багушэвіча была названа палякамі беларускай толькі дзеля вока. Прадбачаньне нашае споўнілася. Палякі гэтую сэмінарыю забіраюць у свае рукі і жадаюць зрабіць з яе калі ня зусім польскую, дык утраквістычную. Беларусы вучыцелі на чале з дыр. Астроўскім сэмінарыю гэту пакінулі. Аставаўся ў сэмінарыі толькі Янка Станкевіч, якога паміма яго волі школьныя ўлады з пасады вучыцеля сэмінарыі звольнілі.

„Вось тут і дагадаўся, каму ў рукі то папаўся“,—павінна прыпомніць словы Хр. Багушэвіча беларуская санацыя!

Запярэчаньне.

У апошнім нумары (з дня 3 X. с. г.) полёнафільскай газэты „Наперад“, якая цяпер сталася органам так зв. „Цэнтрасаюзу,“ сказана, што на зьезьдзе гэтага „Цэнтрасаюзу“ былі так-жа прадстаўнікі ад Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Вось-жа заяўляем, што Бел. Інстытут Г. і К., як арганізацыя, ніякіх прадстаўнікоў у вышэй названы „Цэнтрсаюз“ не пасылаў і ўважае названы „Цэнтрсаюз“ больш за палітычнае і выбарчае прадпрыемства, чым за культурна-прасьветную ўстанову.

Цэнтральны Урад Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры.

З газэт.

Аб палітыцы польскай у Віленскай Каталіцкай Духоўнай Сэмінарыі.

Літоўская газэта „Vilniajus „Rytojus“ з дня 20.IX с. г. падае аб недахопе літоўскіх ксяндзоў у Віленшчыне і заклікае літоўскую моладзь пасьвячацца ў духоўны стан. Адначасна гэта газэта выяўляе прычыну недахопу літоўскіх ксяндзоў.

„Vil. Ryt.“ піша — кандыдат на ксяндза літоўскай народнасьці, які паступае ў муры віленскай духоўнай сэмінарыі, прыгатаваны згары на тысячныя зьдзекі і труднасьці. Калі ён ня тaіць сваей народнасьці, ад сваіх вучыцялёў атрымлівае назоў „літвамана“ што месьціць у сабе пагрозу выдаленьня з сэмінарыі. Шмат клерыкаў гэны лёс ужо спаткаў. Пануючы ў сэмінарыі спосаб выдаляньня з яе літоўцаў, моладзь літоўскую адстрашывае ад сутаны.

З другога боку ня менш страшнае зьявішча ў высыланьні ксяндзоў літоўцаў у парахвіі беларускія.

Мы з свайго боку можам пацешыць літоўцаў хіба толькі тым, што не адны яны такія нешчасьлівыя, беларусы таксама адчуваюць „апеку“ польскага „хрысьціянскага“ пастырства, калі не ў такой меры, як літоўцы, дык горш. N.

Беларуска-Украінскі Блёк мае № 11.

Зьезд „Цэнтральнага Саюзу“ беларускіх полёнофілаў.

У суботу 27 і ў нядзелю 28 верасьня с. г. адбываліся нарады беларускіх полёнафілаў у Вільні.

На „зьезд“ гэты яны запрашалі штось праз два тыдні, зьмяшчаючы ў газэце „Наперад“ заклік да ўсіх беларускіх арганізацыяў і інстытуцыяў, каб прысылалі іх прадстаўнікоў.

Калі прышоў час „зьезду“, які так шумна рэклямаваўся, на „зьезд“ прываліла „прадстаўнікоў“ з беларускай вёскі ажно 6-7 чалавек!

Усіх учасьнікаў „зьезду“, разам з арганізатарамі яго, сябрамі „Цэнтр. Саюзу“ і „з прадстаўнікамі“ з вёскі можна было палічыць на пальцах не разуваючыся, бо ўсіх было ажно 26 асоб — даслоўна дваццаць шэсьць асоб! У гэтым ліку некаторыя арганізатары „зьезду“ і сябры „Цэнтр. Саюзу“ былі з сваімі жонкамі.

Апрача ўчасьнікаў гэтага „зьезду“ былі на ім і госьці ў ліку 19 асоб, якія прышлі проста дзеля цікавасьці.

Характар „зьезду“ выявіўся больш палітычны, чымся культурна-прасьветна-гаспадарскі. Ідэолёгія палітычная гэтага „зьезду“ — гэта далейшы цяг думак Умястоўскага.

Але ідзём па парадку. Пачынаюцца нарады „зьезду“. За прэзыдыяльным сталом засядае Антон Луцкевіч, які пасьля срога трымае дысцыпліну, каб ня зыйсьці з намечанай яшчэ калісь Паўлюкевічам лініі. У помач сабе ў прэзыдыум запрашае як асэсараў: Якубёнка і Данілевіча, на сэкрэтара студэнта Ст. Станкевіча, які пасьля высьняе, што ён на гэтым „зьезьдзе“ зьяўляецца госьцем і нікога не прэзэнтуе. (Беларускае студэнства зарганізаванае ў „Беларускі Студэнскі Саюз“ ад учасьця ў гэтым „зьезьдзе“ адмовілася). На парадку дня зьяўляецца між справамі культурна-прасьветна-гаспадарскімі і справы „вялікай“ вагі палітычныя—справа выбараў і палітычная праграма ў форме „наказу для паслоў“, якіх „нашая“ санацыя маецца правесьці ў гэтых выбарах у польскі парлямант.

Пачынаюцца дыскусіі. На арэну выступаюць санацыйныя фігуры: між іншым нядаўна прыблукаўшыся да санацыйнага берагу Ф. Акінчыц і апазыцыянэр сучаснага палітычнага курсу санацыі Янка Станкевіч. Прамоўцы стараюцца атакаваць Беларускі Нацыянальны Камітэт і зацерці факт існаваньня беларускіх палітычных партыяў, якія-б выяўлялі палітычнае імкненьне беларускага народу. Атака гэтая настолькі наіўная, што старшыня „зьезду“ А. Луцкевіч быў змушаны рэагаваць папраўкай, у якой сьцьвердзіў факт існаваньня Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі, якая паводле слоў Луцкевіча зьяўляецца адзінай палітычнай партыяй ў Зах. Беларусі.

У дыскусіях поўная дызгармонія і сябры адзін другога не разумеюць, хто чаго хоча.

Заканчываецца першы акт культурна-прасьветна-гаспадарска-палітычнага „зьезду“ выбарамі кіраўнічага воргану палітычнага культурна-прасьветнага і гаспадарскага „Цэнтральнага Саюзу“.

Старшыня А. Трэпка, сябры: Р. Астроўскі, Ф. Акінчыц, Якубёнак, Шнаркевіч, Кароль і Цеханоўскі. Рэвізыйная камісія: В. Грышкевіч, Міхалевіч, Чатырка, Янка Станкевіч і Данілевіч.

Другі акт „зьезду“ пачынаецца разглядам палітычнай праграмы ў форме „наказу для паслоў“.

Праект праграмы — „наказу“ рэфэруе Ф. Акінчыц. У гэтым „наказе“—абнята ўсё жыцьцё беларускага народу, у рамкі якога хочуць замкнуць санатары будучыню Беларусаў.

З пункту гледжаньня палітычнага „наша“ санацыя прызнае і незалежнасьць Беларускага народу, але сама дамагаецца толькі аўтаноміі. Якая гэта мае быць аўтаномія — ў палітычнай праграме санатараў нічога ня сказана. Аб гэтым хіба ведае толькі начальства...

У дыскусіі над палітычнай праграмай—„наказам“ прыймалі ўдзел і прысутныя на салі „зьезду“, лічба каторых не перавышала 10-ці асоб, бо рэшта паразыходзілася. Пра-

моўцы, крытыкуючы некаторыя пункты палітычнай праграмы, выказываліся розна. Адны дамагаліся, каб зямлёй надзяліць сялян бяз выкупу, а другія казалі, што бяз выкупу зямлі сялянам даваць ня можна. Некаторыя цьвердзілі, што ў школах вучыць дзяцей рэлігіі трэба, а іншыя даказвалі, што рэлігію з школаў трэба выкінуць. Калі адзін прамоўца хацеў уставіць у праграму палітычнага „наказу для паслоў“, каб яны дамагаліся легальным спосабам незалежнасьці для Беларускага народу, старшыня „зьезду“ Луцкевіч спыніў яго заяўляючы, што аб гэтым і гаварыць ня можна, бо гэта „будзе здрадай стану“. Гэта пацьвердзілі другія санатары і палітычная праграма беларускай санацыі ў форме „наказу для паслоў“ прынятая „зьездам“ ў першай рэдакцыі праекту.

У дыскусіях над рэзалюцыямі „зьезду“, якія напісаны мусіць дзеля таго, што „нічога не каштуюць“, як матываваў адну з рэзалюцыяў адзін з прамоўцаў, паднялася цэлая бура ў шклянцы вады.

Янка Станкевіч, мусіць пачынаючы скідаць з сябе санацыйную вопратку, востра заатакаваў сваіх прыяцеляў. Выступаючы ў абароне беларускасьці і праціў пакорнай згоды санацыі на ўтраквізм, заявіў, што ў беларускай вучыцельскай сэмінарыі імені Фр. Багушэвіча пануе больш чымсь утраквізм, а дзеля гэтага беларусы павінны праціў гэтага пратэставаць, а не пакорна згаджацца з лёсам і не павінны прыкладываць сваіх рук да полёнізацыі беларускай моладзі.

Гэтая заява Янкі Станкевіча выклікала на „зьезд“ цэлую буру. Асабліва найбольш абурыўся на Янку Станкевіча старшыня „зьезду“ Антон Луцкевіч, які з абурэньня нават адмаўляўся весьці далей нарады „зьезду“.

Словам, „зьезд“ гэты паказаў ужо слабасьць „нашай“ санацыі, як ідэолёгічную, так і лічбовую сваіх сяброў і прыхільнікаў. Лічыцца з ёй як з нейкай сілай у народзе, пасьля гэтага ня прыходзіцца.

П—к.

З Украінскага жыцьця.

Далейшыя арышты б. паслоў. Дня 1 г. м. паліцыя арыштавала б. украінскага пасла кс. пралата Лявона Куніцкага, кс. Пеліха і Д. Ладыгу.

— 2 г. м. пякельная машына ўзарвала склад украінскага саюзу коопэратываў у Львове „Цэнтрасаюз“. Хто падлажыў бомбу пад гэту ўкраінскую ўстанову, сьледзтва пакульшто ня выясьніла.

— У першых чыслах г. м. школьныя ўлады пры помачы паліцыі закрылі прыватную пачатковую школу, утрымліваную гуртком „Рідной Школы“ ў Чорткові.

Карныя экспэдыцыі, якія высланы ў украінскія вёскі, утрымліваюць замажнейшыя сяляне грэка-каталіцкага вызнаньня. Прад прыходам у вёскі жаўнераў, солтысы павінны падаць уладам спіс кватэр багацейшых гаспадароў!

— У Хадачкове Малым арыштавана 14 украінскіх сялян на чале з сьвяшч. а. М. Осадцо.

— У Тарнопальскай турме пасаджана больш 20 асоб украінцаў.

— У Берэжаншчыне карная экспэдыцыя даканала масавай рэвізіі ў тамашніх украінскіх установах і прыватных памешканьнях вызначнейшых грамадзян.

— У Дрогобыцкім павеце ўлады закрылі 13 украінскіх бібліятэк-чытальняў.

— У зьвязку з закрыцьцем арганізацыі моладзі „Украінські Пласт“ даканана амаль у ва ўсіх аддзелах гэтай арганізацыі рэвізіі.

— У Тарнопалі і Рагатыне закрыты дзьве ўкраінскія гімназіі. Вучняў гэтых гімназіяў польскія школы ня хочуць прыймаць.

Інтэрвэнцыя. Усправе сучаснага палажэньня на Украінскіх землях мітрапаліт Шэптыцкі інтэрвэньяваў у львоўскага ваяводы і ў міністэрстве ў Варшаве. Апрача мітрапаліта Шэптыцкага інтэрвэньявалі ў міністэрстве так-жа і выдатнейшыя украінскія дзеячы.

Не перастаюць падпаліваць. Як падаюць польскія газэты, апошнім часам на абшарах львоўскага ваяводзтва адбываюцца ўсьцяж новыя акты саботажу, іменна падпальваньне копаў і гумнаў з збожжам.

З выбарнага фронту.

Беларускі і Украінскі блёк. Беларускія арганізацыі, якія аб'ядналіся пад сьцягам Бел. Нац. К-ту, заключылі выбарны блёк з украінскімі групамі, якія на выбары злучыліся ў адзіны украінскі блёк. Ужо паданы ў Гэнэральную Выбарную Камісію сьпіскі кандыдатаў у Сойм і Сэнат Беларускага і Украінскага блёку.

Праваслаўны кансыстор агітуе за Б. Б. „Дзен. Віл.“ падае, што на тайных нарадах сяброў праваслаўнай кансысторыі ў Вільні пастаноўлена падтрымаць на гэтых выбарах у Сойм і Сэнат сьпісак Б. Б.

Сябры кансысторыі сьвяшч. Кушнёў, архім. Марозаў, Тучэўскі і Краскоўскі ўжо разьяжджаюць па праваслаўных парахвіях Зах. Беларусі і арганізуюць выбарныя камітэты Беспартыйнага Блёку Супрацоўніцтва з Урадам.

Дзеля гэтага трэба спадзявацца, што праваслаўнае духавенства ў нашым краю, якое ў большасьці па нацыянальнасьці расейскае, будзе намаўляць сваіх парахвіян беларусаў, каб галасавалі за Б. Б.

Ці паслухае наш селянін „духоўных пастыроў“ у гэтай справе, спадзявацца трудна, але што „пастыры“ пастараюцца агітнуць за палякоў, сумніву няма. Трэба-ж слухаць начальства.

У Наваградчыне польскія ксяндзы арганізуюць выбарныя камітэты з польскімі абшарнікамі. У палавіне верасьня с. г. польскія ксяндзы з панамі абшарнікамі зарганізавалі ў Наваградку павятовы Хрысьціянскі Выбарны Камітэт. Камітэт гэты складаецца з ксяндзоў: Вэнцкевіча, Жэры і паноў: Амбрашкевіча, графа Юндзіл-Бялінскага і інш.

На правінцыі ксяндзы ўжо арганізуюць парахвіяльныя выбарныя камітэты.

Гэтая арганізацыя абапёрлася на адозве Пінскага каталіцкага біскупа, якая выдана ў першых чыслах верасьня ў справе выбараў.

Камітэт гэты імкнецца аб'яднаць на выбары ўсіх польскіх паноў і ксяндзоў у нашым краю.

Беларускаму сялянству з гэтай арганізацыяй зусім не падарозе.

З Польшчы.

За свабоду выбараў. Марш. Сойму Дашынскі выслаў Прэзыдэнту мэмор'ял аб палітычным палажэньні Польшчы. Між іншымі гаворыць ён аб нядаўняшніх падзеях у Варшаве, дзе было 2-х забітых і каля 100 раненых, аб арыштах паслоў, паняверцы канстытуцыі, зьнявагах паслоў, аб празываньні народу „народам ідыётаў“ аб кіраваньні краем пры помачы паліцыі, цэнзуры і г. д. У канцы Дашынскі просіць Прэзыдэнта, каб скарыстаў з свайго моральнага і праўнага ўплыву, каб выбары былі чыстыя і свабодныя.

Дзяржаўныя спіскі кандыдатаў у Сойм і Сэнат ужо паданы. Усіх спіскаў падана 20. На першым месцы дзяржаўнага спіску ў Сойм Б.Б. кандыдуе марш. Я. Пілсудзкі.

Да нас пішуць.

НА ВЫБАРЫ ГАТОВЯЦЦА І НАШЫ ВЯСКОЎЦЫ.

Гервяты, Віл.-Троцкага пав. Ужо і нашым сялянам прыходзіць розум у галаву. Першыя і другія выбары яны праваронілі галасуючы за розныя „Вызваленьні“ і Б. Б. Але цяпер, кажуць, ужо ашукацца не дадуцца. Сяляне ўжо самі кажуць, што беларусы павінны галасаваць толькі за беларусаў, бо ўсялякія абяцанкі чужынцаў на нішто не прыдаліся. Галасуючы за беларусаў, калі не паправіш сялянскага лёсу цяпер, то прынамсі пакажаш сваю народную беларускую сілу, з якой мусяць лічыцца праціўнікі і прызнаваць для беларускага народу належныя яму правы. А тады, як беларускі народ будзе мець належныя правы, паправіцца лёс і беларускага сялянства, бо на Беларусі сялянства становіць большасьць. Дык нашы вяскоўцы цяпер ужо гатовяцца, каб аддаць на выбарах свае галасы за беларускі сьпісак.

І. Б.

КСЯНДЗЫ ЗА ПАНОЎ АГІТУЮЦЬ.

Мядзьведзічы, Баранавіцкага пав. Нядаўна Пінскі каталіцкі біскуп выдаў адозву аб выбарах, пасьля каторай нашы ксяндзы і загаварылі аб выбарах. Цяпер ужо дык і не сьціхаюць агітаваць. А ўсё за паноў і за паноў. Здаецца, што можа мець супольнае хоцьбы такі біскуп і ксяндзы з панамі, а вот агітаваць, дык за іх агітуюць.

Добра было-б, каб палітыку выгнаць з нашых касьцёлаў. Тагды-б і наш беларус скарэй прасьвятлеў!

Г.

КРЫХУ АБ ВЫБАРАХ У ГМІННУЮ РАДУ.

Моўчадзь, Баранавіцкага пав. Сёлета ў нашай гміне адбыліся выбары ў гмінную раду. Як праводзяцца ў нашым краю выбары ў самаўрады і якая пры гэтых выбарах справядлівасьць кожны ведае. Застасавана было гэта і ў нас пры выбарах у гмінную раду. У выніку гэтых выбараў аказалася, што на 12 радных толькі 3-х сялян беларусаў. Рэшта абшарнікі, ксёндз і жыды. А трэба ведаць, што насельніцтва нашай гміны складаецца ў вялікай большасьці з сялян беларусаў.

Гэтая рада выбрала на войта абшарніка. Але дзеля таго, што ў радзе шмат абшарнікаў, дык і між імі няма суладу.

Дрэнна робяць нашыя сяляне, што не дацэніваюць значэньня выбараў. Беларускае сялянства мусіць дасюлешніх сваіх поглядаў—„абойдзецца без нас“ — вырачыся, бо калі ня будзе думаць само за сябе, дык няма чаго і чакаць папраўы свайго лёсу.

Дарма ніхто нічога не дае і дабрадзеяў тых на якіх наш селянін спадзяецца таксама няма. Трэба самым аб сабе дбаць.

Крапіва.

ЯК МЯНЕ ПЕРАРАБЛЯЛІ З БЕЛАРУСА НА ПАЛЯКА.

Солы, Ашмянскага пав. Каля нас людзі моцна спалянізаваныя. Таксама і я змалку быў спалянізаваны і ня ведаў, што гэта за слова „Беларусь“. Цяпер я ўжо пачаў прыходзіць да свайго розуму беларускага і магу сказаць другім, што я не паляк, а беларус. У гэтай карэспандэнцыі хачу расказаць, як з мяне рабілі паляка. Вучыўся я ў польскай паўшэхнай школе, дзе з мяне і хацелі зрабіць паляка, але не ўдалося. У той школе забаранялі нават гаварыць па нашаму, ды ня толькі ў школе і ў роднай хаце вучыцель забараняў гаварыць пабеларуску. Ён прыказываў, каб з бацькамі і з дзецьмі ў вёсцы вучні гаварылі папольску. Мой вучыцель надтаж ня любіў беларускіх кніжак і прыказываў вучням, каб іх палілі, калі каторы дзе з ёй спаткаецца. Але я дык вучыцеля ў гэтай справе не паслухаў. Папаў мне, помню, у рукі беларускі календар-кніжка, дык я замест яго спаліць, як прыказываў вучыцель, часьценька чытаў, хаваючыся ад вучыцеля. Цяжка было самому вучыцца па свойму чытаць з каляндара, але неяк даваў раду і дзякаваць Богу пабеларуску чытаю добра. Вучачыся з беларускага календара чытаць па свойму трэба было яшчэ і хавацца ня толькі ад вучыцеля, але і калегаў вучняў, бо вучыцель прыказываў, каб адны другіх сачылі і яму даносілі.

Адзін раз залавіў мяне мой таварыш з гэтым календаром у руках. Сколькі напрасіўся яго, каб не казаў вучыцелю, не паслухаў і данёс. Тады дык я пацярпеў. Вучыцель сьпярша на мяне скрыва пагляпаў праз нейкі час, а пасьля заклікаў мяне ў свой пакой па лекцыях і прыказываў, каб прынёс яму сваю кніжачку-календар. Але я пастанавіў усёж-такі гэтай кніжкі не аддаць за ніякую цану і не аддаў.

Дык вось як з мяне хацелі зрабіць паляка.

Д—і.

З заграніцы.

Сэсія Лігі Народаў закончылася дня 3 г. м. Сёлетняя восенская сэсія Лігі Народаў мела на парадку дня між іншымі справамі і справу абароны народных меншасьцяў. Аднак на гэтай сэсіі ня вырашана ані адна справа. Дэлегаты дзяржаў пагаварылі, падалі кожны свае праекты, ні ўваднэй справе не згадзіліся і раз'ехаліся. Словам, няма ў сучасных кіраўнікоў дзяржавамі добрай волі, каб ісьці на спатканьне волі, роўнасьці і брацтва.

Рэвалюцыя ў Бразыліі (паўдзённая Амэрыка). У апошнія часы выбухла ў Бразыліі рэвалюцыя. Паўстанцы б'юцца з урадавым войскам. Ёсьць многа забітых і раненых.

Зл. Штаты Амэрыкі. У Нэв-Іорку трохтысячная таўпа камуністаў уварвалася ў салю, дзе прэзыдэнт Гувэр прамаўляў да сабраўшыхся людзей і хацела перашкодзіць прэзыдэнту прамаўляць. Некалька сот паліцэйскіх таўпу камуністаў разагнала гумовымі палкамі.

У Францыі дэмонструюць манархісты. Падчас, калі міністр Бріян вяртаўся з Жэнэвы, на вакзале ў Парыжы манархісты спаткалі яго вялікім пагардлівым крыкам. Паліцыя разагнала дэманстрантаў і арыштавала 50 асоб.

Камуністы ў С.С.Р.Р. хочуць скасаваць ноч. Аб тым, што камунізм — гэта фантазія тэорэтыкаў кожны ведае. Але каб фантазія камуністаў сягала нават да таго, што і ноч трэба і можна скасаваць, дык хіба яшчэ ніхто не падумаў. Аднак камуністы задумалі „ліквідаваць" і ноч.

Адзін камуністычны „спэц" заявіў у газэтах, што ён прыдумаў спосаб, як можна скасаваць ноч. Паводле выдумкі гэтага камуністычнага „вучонага" ўвесь сьвет у начы можна асьвятліць электрычаствам. Бальшавіцкія газэты гэтую думку скасаваньня ночы падхапілі і раструбілі на ўсю Расею.

Словам, фантазіі ў камуністаў канца няма.

З краю.

Рэвізіі ў беларусаў. „Дз. Віл." падае, што па загаду адміністрацыйных уладаў дакана рэвізія ў беларускіх дзеячоў на тэрыторыі Віленскага ваяводзтва. У часе гэтай рэвізіі быццам знайдзена аружжа, амуніцыя і гранаты.

Пажары. Паводле падлічэньня страхавога т-ва ў гэтым годзе на тэрыторыі віл. ваяводзтва згарэла 475 гаспадарак, 725 хатаў, 45 рожных складаў, 6 бажніцаў, 22 лазьні і каля 50 іншых будынкаў. За лета згарэла 1256 га лесу.

Слабое зацікаўленьне выбарамі. Да нас даходзяць весткі, што сяляне Зах. Беларусі і Усх. Літвы вельмі слаба цікавяцца выбарамі. Вясковыя грамадзка-палітычныя дзеячы не спадзяюцца высокай фрэквэнцыі галасуючых. Слабое зацікаўленьне выбарамі сялян тлумачаць ня верай сялянства ў папраўу іх лёсу праз выбары.

„Жывы нябошчык." Нядаўна здарыўся ў засьц. Жураўка, Сьвянцянскага пав. сумны выпадак, які прынёс сьмерць для аднае асобы.

Жыхар таго-ж засьц. З. Бычко заснуў летаргічным сном (пазорная сьмерць). Бычко спаў некалькі дзён. Сям'я ўважаючы, што Бычко памёр, зрабіла труну і зьбіралася да пахаронаў. У ночы прад пахаронамі Бычко ўстаў з труны і вадышоў да сваей сьпячай жонкі. Жонка ўбачыўшы прад сабой быццам памёршага мужа так спужалася, што дастаўшы атак сэрца памёрла. „Жывы нябошчык" спужаўшыся сам пачаў крычаць, а сын яго Міхал 25 г. уважаючы, што мае дзела з марай схапіў сякеру і хацеў забіць бацьку.

Бычко выбег на двор і пачаў клікаць на ратунак. Недаклікаўшыся нікога забег у хату суседзяў, якія ўбачыўшы яго са страху памлелі. Бычко зразумеўшы, што зьяўляецца ахвярай непаразуменьня пабег на пастарунак пагранічнай стражы і аб усім расказаў. Камандант пастарунку вытлумачыў перапалоханым сялянам гэнае зьявішча і толькі тады Бычко вярнуўся да хаты і яго ўжо не ўважалі за нябошчыка.

Наша пошта.

Дубіцкаму. Атрымалі, дзякуем, карыстаем, пішыце больш.

К. Яковічу. Газэту пасылаем, дамагайцеся на пошце. За праўду змагайцеся. Праўда пераможа.

Ул. Жуку. Газэту пасылаем, пішыце, што ў Вас чуваць.

Яркаўцу. Брату газэту пашлём.

Бублевічу. Газэту пасылаць будзем.

Крапіва. Атрымалі, дзякуем, карыстаем.

Барзду. Газэту пасылаць будзем, прысылайце падпіску.

Гінько. Газэту пасылаць будзем з наступнага м-ца, прысылайце падпіску.

Газэту пасылаем у гэтым месяцы: В. Чычыро, С. Зьверко, Ул. Рабізо, Ф. Вербіцкаму, Ю. Дарашэвічу і П. Арцішэўскаму.

Сьпірыдовічу. Пісьмо атрымалі, дзякуем, скарыстаем, у свой час усё прыслана будзе.

Вашковічу. Пісьмо атрымалі, пры магчымасьці скарыстаем.

Чайку. Газэту будзем пасылаць з наступнага м-ца.

А. Ражычко. Прыхіляючыся да Вашай просьбы газэту пасылаць будзем.

Сьветавастоку. Білет рэч ня важная, з прысланага скарыстаем.

Славінскаму. Газэту пасылаем, трэбуйце на пошце.

На газэту грошы атрымалі ад: І. Якімовіча 2 зл. і С. Славінскага 1 зл. 50 гр. дзякуем.

Чай. З Вашым пісьмом зусім згаджаемся.

Хутка выйдзе з друку
Календарык „Шляху Моладзі" на 1931 год.
Календарык гэты абымае стары (праваслаўны) і новы (каталіцкі) стыль і каштуе ўсяго
30 грошай
Падпішчык „Шляху Моладзі" календарык гэты атрымае бязплатна.
Выпісаць можна з кнігарні „ПАГОНЯ" Вільня, Людвісарская вул. № 1 і з выд. „Шляху Моладзі" Вільня, Завальная вуліца 6—10

За прыкладам мінулых гадоў
Беларуская Кнігарня „Пагоня" ладзіць танную прадажу беларускіх кніжак.
Празначаныя на танную прадажу кніжкі, а такжа і танная цана іх абазначаны чырвоным атрамантам у каталёзе кнігарні „Пагоня", які гэта кнігарня высылае бясплатна.
ГРАМАДЗЯНЕ! Карыстайце з рэдкай магчымасьці купіць танна беларускую кніжку, — выпісвайце каталёг, выбірайце ў ім патрэбныя Вам кніжкі і выпісвайце іх!
Кніжкі на правінцыю кнігарня „Пагоня" высылае пасьля атрыманьня ўсей вартасьці заказу, або накладвай платай (za pobraniem).
Перасылка на кошт заказчыка.
БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ „ПАГОНЯ"
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1.

Nadzwyčajnaja akazija na zimu!
Abminajcie pasrednikaŭ i pierakupščykaŭ, nabywajcie tawary prosta z pieršaj krynicy, — na paławinu taniej, čym u wašych miascowaściach. Zaaščadžajcie ciažka zapracawanyja hrošy, wydawanyja ŭ wašych wakolicach, dyk atrymajecie ŭ nas padwojnuju kolkaść tawaru. Cały kamplekt tolki za 41 zł. 40hr. jaki nadajecca dla kožnaha domu, a imienna: 3 mtr. waŭnianaha bastonu padw. šyryni na elehanckaje mužskoje ŭbrańnie, abo palto damskaje (koler, pawodle žadańnia) 3 mtr. pieknaha šoŭku z najnawiejšymi deseniami na pieknuju i światočnuju sukniu. 3 mtr. anhielskaha zefiru na dziennuju mužskuju kašulu (najnawiejšyja ŭzory), 1 para zanočych partok piekna prybrana z dobraha pałatna. 1 dobry kuchonny ručnik, 1 chustka tureckaja na haławu z pieknymi kraskami, 3 nasowyja chustački (nasatki) i adzin duža pryhožy, šaŭkowy halštuk (krawat) światočny. 1 para paŭšaŭkowych škarpetak mužskich.
Usio heta razam wysyłajem tolki za 41 zł.40 hr. za zaličkaj paštowaj, pa atrymańni listowaha zawiedamleńnia. Płacicca pry atrymańni z pošty pierasyłki.
Kuplajučy ničoha nie ryzykuje dziela taho, što kali tawar nie padabajecca, prymajem jaho iznoŭ, a hrošy adsyłajem. Tyja, katoryja adrazu prysyłajuć 3 zł. nia płaciać koštaŭ apakunkowych i apłaty paštowaj.
Zakazy prosimo adresawać:
Właść. O. i G. Grynfeld
dawn. „Polska Wytwórnia"
Łódź, Nowomiejska 17.
Cennik na ŭsialakija tawary wysyłajem biasplatna.
UWAHA: Taniej užo być nia moža!

MAŠYNY DA ŠYĆCIA
systemu SINGERA, pieršaradnaj dabraty naharodžany załatymi medalami prapanuje:
Józef Ankudowicz
Warszawa, Nowogródzka 2.
Nožnyja banbenkawyja I hatunak 270 zł., gabinetawyja krytyja 320 zł., wialikija krawieckija 330 zł. Tolki hetyja najtrywalejšyja i najbolš adpawiednyja na prawincyju.
Pradaža mašyn pa canie fabryčnaj dla hurtaŭnikaŭ, ahientaŭ i prywatnych asob.
15-cihodniaja hwarancyja.
Wysyłajem na prawincyju za zaličeńniem kalajowym pa atrymańni poštaj **50 zł. zadatku.**
Pierasyłka i apakawańnie na košt firmy.
Cenniki i abjaśnieńni wysyłajem na žadańnie **biaspłatna.** — **Uwaha: Firma Chryścijanskaja.**

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Янка Шутовіч